**19.** Вучні атрымалі заданне выпісаць словы з прыстаўнымі гукамі. Янка выпісаў словы *войкаць, вокліч*; Сымонка – *ганак, вохра*; Алесь – *унук, опера*.

Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Янка.
**Г)** Сымонка. **Д)** Алесь.

**20.** Здаўна існуе ў народзе выраз: “*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы*”. Гэты выраз з’яўляецца … .

**А)** загадкай. **Б)** скорагаворкай. **В)** прыпеўкай.
**Г)** прыказкай. **Д)** прымаўкай.

**21.** Адпаведнік рускага слова *крючок* (для застежки) у беларускай мове – … .

**А)** аплік. **Б)** кручок. **В)** пятліца.
**Г)** вушка. **Д)** прыробка.

**22.** У народзе існуе прыкмета: *На дрэвах з’явіліся жоўтыя лісты ў пачатку жніўня – наступіць ранняя … .*

**А)** вясна. **Б)** восень. **В)** зіма. **Г)** ноч. **Д)** зара.

**23.** Якія з дадзеных слоў у рускай і беларускай мовах адрозніваюцца месцам пастаноўкі націску?

*1) маладосць; 2) дакумент; 3) фартух; 4) алфавіт.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**24.** *Страва са свежай рыбы з прыправамі; рыбны адвар* называецца … .

**А)** булён. **Б)** боршч. **В)** зацірка. **Г)** юшка. **Д)** халаднік.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 30500 экз. г. Мінск. 2017 г.

Конкурс па беларускай мове
## «БУСЛІК-2017»

*Чацвер, 16 лютага 2017 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца тryма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Жвавывожыкжыважукупашыўкажух.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**2.** У народзе гавораць: “*Многа ведай, ды …*”. Закончыце выраз.

**А)** мала гавары. **Б)** больш рабі. **В)** мала рабі.
**Г)** больш гавары. **Д)** мала слухай.

**3.** Дапамажыце гераіні верша П. Сушко “Дзесяць качак” падлічыць, колькі качак паляцела.

*Дзесяць качак ляцелі,*
*На вадзе дзве з іх селі.*
*Праз хвілінку ў траве*
*І яшчэ селі дзве.*

*Ведаць Таня хацела,*
*Колькі ж іх паляцела.*
*Хто лічыць добра можа,*
*Хай дзяўчынцы паможа.*

**А)** 4. **Б)** 6. **В)** 8. **Г)** 10. **Д)** 12.

**4.** *Ансамбль з чатырох выканаўцаў* называецца … .
**А)** квінтэт. **Б)** трыа. **В)** квартэт. **Г)** секстэт. **Д)** дуэт.

**5.** Здаўна ў народзе кажуць: *“Добрае слова далёка … .”*
**А)** чуваць. **Б)** шукаць. **В)** хаваецца.
**Г)** асыпаецца. **Д)** плыве.

**6.** Колькі разоў сустракаецца [в’] у скорагаворцы?
*Пад вываратнямі вёртка віла вяроўку вавёрка.*
**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**7.** Закончыце вершаваныя радкі Соф’і Шах.
*Стаіць, нібы мяцёлка,*
*Лісточкі, бы іголкі,*
*А ягады, бы шышкі.*
*Больш любіць ён зацішкі, –*
*Там промні сонца ловіць*
*Зялёненькі … .*
**А)** сасоннік. **Б)** бярэзнік. **В)** арэшнік.
**Г)** ядловец. **Д)** маліннік.

**8.** Якім словам з дадзеных можна выказаць сэнс устойлівага спалучэння *ва ўсё горла*?
*1) падманваць; 2) паспешліва; 3) пакрыўдзіцца; 4) моцна.*
**А)** няма патрэбнага слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**9.** У перакладзе з рускай мовы на беларускую слова *кружка* – … .
*1) конаўка; 2) кубак; 3) куфель.*
Выберыце патрэбны варыянт.
**А)** няма патрэбных слоў. **Б)** усе дадзеныя словы.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Якія літары з дадзеных названы няправільна?
1) з – зэ; 2) л – лэ; 3) м – мэ; 4) н – нэ.
**А)** усе літары. **Б)** усе літары названы правільна.
**В)** усе літары, акрамя 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**11.** Колькі слоў можна скласці з літар Б, К, У?
**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**12.** Дапоўніце вершаваную загадку А. Вольскага.
*Над новаю хатай пастаўлены кроквы:*
*Дзве жэрдкі вуглом і між імі адна.*
*Прыгледзьцеся добра, і нават здалёк вы*
*Адразу пазнаеце літару … .*
**А)** Ю. **Б)** Ш. **В)** А. **Г)** П. **Д)** У.

**13.** Якое слова з дадзеных мае падоўжаны [ж]?
*1) дажджы; 2) збожжа; 3) прыезджы.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**14.** Выберыце словы, у якіх ёсць два мяккія зычныя гукі.
*1) сняжынка; 2) разьба; 3) дзядзька; 4) кіпень.*
**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**15.** Якія словы з дадзеных напішаце з апострафам?
*1) раз..ба; 2) шчаў..е; 3) узмор..е; 4) аб..ява.*
**А)** усе словы. **Б)** толькі 4. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** У якіх словах з прапанаваных ёсць адзін мяккі зычны гук?
*1) суфікс; 2) елкі; 3) праязны; 4) снежань.*
**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Выберыце з прапанаваных словы з падвоенымі зычнымі.
*1) пытанне; 2) аддаць; 3) бяздонны; 4) жыццёвы.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**18.** Выберыце словы, у якіх націск падае на апошні склад.
*1) цяжар; 2) хвалісты; 3) квартал.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.